**Анатоль АСТАПЕНКА**
***Мінськ***

# АБ УКЛАДЗЕ КНЯЗЁЎ АСТРОЖСКІХ У БЕЛАРУСКУЮ НАЦЫЯНАЛЬНУЮ СПАДЧЫНУ

*В статті наголошується, що три постаті, три князя Острозьких Федір, Костянтин Іванович і Костянтин (Василь) Костянтинович – це білоруська славна історія, національна гордість, міцний підмурок білоруської національної ідеї. Діяльність князів Острозьких – це теорія і практика становлення білоруської нації у Великому князівстві Литовському. Князі Острозькі першими звернули увагу на необхідність всебічного розвитку людини, що поєднує в собі риси благовірного християнина і національно-свідомої людини, показали нерозривний зв‘язок патріотизму, любові до Батьківщини з християнством – за кілька віків до сучасних уявлень про християнські витоки нації.*

*Ключові слова: Князі Острозькі, Велике князівство Литовське, білоруська національна ідея, патріотзм, християнство.*

Тры постаці, тры князі Астрожскія Фёдар, Канстанцін Іванавіч і Канстанцін (Васіль) Канстанцінавіч – гэта нашая слаўныя гісторыя, нашая нацыянальная гордасць, гэта трывалы падмурак нацыянальнай беларускай ідэі.

Аднак, у Беларусі імя князёў Астрожскіх амаль не вядомае шырокаму колу насельніцтва. У асяродку беларускай праваслаўнай Царквы можна знайсці інфармацыю пра прападобнага Фёдара (Астрожскага) (год нараджэння невядомы – год смерці 1438). Канстанцін Іванавіч Астрожскі (1460–1530) вядомы, галоўным чынам, як ваенаначальнік у бітве ВКЛ з Маскоўскай дзяржавай 8 верасня 1514 г. А Канстанціна Канстанцінавіча Астрожскага (1527–1608) гісторыкі ведаюць як абаронцу праваслаўя і непрымірымага барацьбіта супраць уніі.

Гэтыя людзі – гонар і слава Беларусі, гэта нашая гісторыя, падмурак і аснова сучаснага развіцця нашай краіны і напэўна яе будучага. Уклад ў нацыянальную спадчыну Беларусі нашых слаўных князёў Астрожскіх параўнальны, калі не вышэйшы за расійскага Мініна ці украінскага Багдана.

Усе тры асобы, пра якія ідзе гаворка, маюць дачыненне да гісторыі як Беларусі, так і Ўкраіны, бо ў часы іх дзейнасці (XV–XVI ст.) нашы дзяржавы існавалі як адзіная дзяржава Вялікае Княства Літоўскае. Аднак карані Астрожскіх знаходзяцца ўсё ж на Беларускіх землях і ў дзейнасць князёў больш тычыцца менавіта Беларусі. Пра дзейнасць князёў Астрожскі і іх унёсак у беларускую духоўную спадчыну найбольш дэталёва і шчыра напісала Алена Яськевіч у кнізе «Падзвіжнікі і іх святыні»[1].

У дадзеным артыкуле пастаўлена задача вылучыць тыя адпраўныя моманты, што тычацца укладу князёў Астрожскіх ў развіццё менавіта беларускай нацыянальнай культуры.

Фёдар (Феадор – пасля пострыгу) Данілавіч Астрожскі быў старэйшым сынам у сям'і роду князёў Астрожскіх. У 1436 г., пасля смерці бацькі, ён становіцца багатым землеўласнікам. Адначасова яму перайшло ў спадчыну права апекі над усімі праваслаўнымі цэрквамі і манастырамі на сваіх землях. Князь Фёдар быў багатым магнатам, вядомым воінам і аўтарытэтным дыпламатам. Сучаснікі называлі яго «мужам з усіх правадыроў Літвы і Русі, вялікай смеласці і велізарнага аўтарытэту». Але нечакана Гасподзь паклікаў яго да іншай дзейнасці. Ён адмовіўся ад княжай славы і прыняў інацтва ў Кіева-Пячэрскай лаўры з імем Феадосій. У старажытных


© Анатоль Астапенка

царкоўных спевах праслаўляецца яго «пакорнае паслушэнства і маўчальніцтва», а таксама руплівасць на ніве добрых спраў і хрысціянскай любові. Ужо з канца XV ст. ён стаў ушаноўвацца як святы. Нятленныя мошчы прападобнага Фёдара і цяпер пакояцца ў Дальніх пячэрах Кіева-Пячэрскага манастыра побач з іншымі праведнікамі і цудатворцамі.

У 2002 г. Фёдар Астрожскі быў далучаны да ліку беларускіх святых. Па заказу беларускага праваслаўнага Брацтва ў гонар Віленскіх Мучанікаў была напісана ікона прападобнага. 22 мая 2004 г. адбылося перанясенне іконы з часціцамі мошчаў прп. Фёдара Астрожскага са Свята-Пятра-Паўлаўскага сабору г. Мінска ў дамавую капліцу брацкага дома «Кінанія» (пас. Калодзішчы, Мінскі р-н). Цяпер гэта адзінае месца ў Беларусі, дзе ў памяць прападобнага створана дамавая царква і тут мяркуюць пабудаваць у яго гонар капліцу.

Манаскі подзвіг прападобнага Фёдара Астрожскага не выпадковая падзея. Ён працягвае традыцыі манаства ў Беларусі, якія маюць тысячагадовую гісторыю і звязаныя з такімі імёнамі як Ефрасіння Полацкая, Кірыла і Лаўрэнцій Тураўскія, Елісей Лаўрышаўскі, Афанасій Філіповіч і іншыя. Здабыткі ўзнёслай духоўнасці, якія звязаныя з беларускімі праваслаўнымі традыцыямі ніколі не перарываліся, яны апераджалі, выпрацоўвалі традыцыі усходнеславянскага аскетызму, потым яны існавалі паралельна з маскоўскім праваслаўем і існуюць у наш час. І прыклад Астрожскіх – гэта характэрная рыса беларускага менталітэту і беларускай місіі.

Канстанцін Іванавіч Астрожскі (1460–1530) быў праўнукам Фёдара Астрожскага. Меў вельмі высокую пасаду – найвышэйшы гетман Вялікага княства Літоўскага, кашталян Віленскі, ваявода Трокскі. К. І. Астрожскі паказаў сябе як выдатны дзеяч праваслаўнай асветы, заснаваў і садзейнічаў развіццю мноству праваслаўных храмаў. Аўтарытэт гетмана ў ВКЛ быў настолькі высокі, што польскі кароль ня гледзячы на адданасць князя праваслаўю, давяраў яму самыя важныя дзяржаўныя справы, аб чым і сведчыць яго прызначэнне гетманам. У гісторыю князь К. І. Астрожскі ўвайшоў як выдатны ваенаначальнік. А перамога войска ВКЛ над маскоўскім у бітве пад Воршай 8-га верасня 1514 годзе, якую заслужана лічаць абвязанай бліскучаму камандаванню К. І. Астрожскага, стала векапомнай падзеяй усёй беларускай гісторыі. На жаль, засяродзіўшыся толькі на гэтай бітве, многія пісьменнікі і гісторыкі, не надаюць дастойнай ўвагі іншай, не менш значнай для Беларусі, дзейнасці князя. Так у кнізе «Дзесяць вякоў беларускай гісторыі» У.Арлова і Г. Сагановіча бітве пад Воршай прысвечаны цэлы артыкул. Пра іншую дзейнасць Канстанціна Астрожскага і пра іншых Астрожскіх не сказана ні слова.

Маскоўскія гісторыкі традыцыйна асвятляюць падзеі XVI ст. як барацьбу маскоўскага праваслаўнага царства з «лацінствам» Польшчы і Літвы. Аднак мала хто апісвае тыя войны як войны двух праваслаўных дзяржаў ВКЛ і Маскоўскай дзяржавы. І нават пазней, калі ВКЛ ўвайшло ў склад Рэчы Паспалітай львіная доля войскаў гэтай дзяржавы складалі выхадцы з тэрыторыі сучаснай Беларусі і Ўкраіны – г.зн. былі ці праваслаўнымі, ці каталікамі ўсходняга абраду. Толькі тады, калі гаворка заходзіць аб князях Астрожскіх «тэндэнцыйнае мысленне» не дазваляе ім выкарыстоўваць традыцыйны «антылацінскі» падход і ўсё ж адзначыць факт існавання праваслаўя на Беларусі.

Вось як піша М. І. Кастамараў[2] пра князя Канстанціна Іванавіча Астрожскага: «Правнуком Федора Острожского, знаменитого своей борьбой за Русь против Польши, был знаменитый Константин Иванович, гетман литовский, верный слуга польского короля, бывший в плену у Ивана III и потом отомстивший за свой плен поражением, нанесенным московскому войску под Оршею. Вражда к православной Москве и верная служба королю-католику не мешали ему славиться православным благочестием. Он щедро строил и украшал православные церкви, вместе с тем заводил при церквах школы для детей и, таким образом, полагал начаток русского просвещенія».

Некаторыя беларускія гісторыкі, напрыклад, пісьменнік-гсторык У. Арлоў, адмаўляючы імперскае мысленне ў трактоўцы нашай гісторыі, аўтаматычна і адмаўляюць праваслаўны фактар у гісторыі ў гісторыі нават Полацка-Тураўскага перыяду, не кажучы пра ВКЛ. Насамрэч ня трэба адкідаць гэты праваслаўны чыннік беларускай гісторыі ні на карысць уніі, ні каталіцызму. На Усходзе Еўропы існавала дзве праваслаўныя дзяржавы, два пастаянныя супернікі – ВКЛ і

маскоўская дзяржава. І ў нашай гісторыі перыядычна з'яўляюцца такія падзвіжнікі і пабornікі праваслаўя як князі Астрожскія.

Многія сучаснікі К. І. Астрожскага адзначаюць ягоную непахісную вернасць праваслаўю. Ён не проста не прыняў ідэі уніі, якая была вельмі моднай у часы яго быцця, а стаў прыкладам адданасці веры продкаў для тых хто яшчэ хістаўся, ці станавіўся на шлях прозілетызму. Вось адна з вызначальных рысаў беларускага патрыятызму – адданасць свайму народу, яго звычаям, яго спрадвечнай веры – праваслаўю.

К. І. Астрожскі рупіўся аб высокім статусе служыцеляў праваслаўная царквы, каб яны ні ў чым не заступалі каталіцкім святарам. Для такіх мэтаў па яго ініцыятыве быў скліканы Сабор Духавенства ў 1508 – 1509 гг.

Пасля аршанскай перамогі кароль Сігізмунд дазволіў князю Канстанцін Іванавічу Астрожскаму пабудаваць каменныя цэрквы ў Вільні – Троіцкую і Нікольскую.

У 1523 г. кароль Сігізмунд па просьбе Канстанціна Астрожскага даў дазвол ігумену Макарыю аднавіць Кіеўскі Міхайлаўскі Златаверхі манастыр і заснаваў у ім манаскую абшчыну. Дзякуючы намаганням К.І. Астрожскага было цвёрда вызначана юрыдычнае становішча Праваслаўнай Царквы ў ВКЛ, якое да яго было вельмі ня акрэсленым. Князь Констанцін Астрожскі садзейнічаў матэрыяльнаму забеспячэнню цэркваў, умацаванню рэлігійнага мыслення і падняццю дабрачыннасці праваслаўных хрысціян. Усяго за час дзейнасці Канстанціна Астрожскага Праваслаўная Царква ў ВКЛ атрымала больш за 20 грамат, якія пашыралі і сцвярджалі яе правы. Канстанцін Іванавіч Астрожскі спрыяў адкрыццю ў Вільні ў 1524 г. тыпаграфіі, адкуль выйшлі кнігі, надрукаваныя Францыскам Скарынай.

Князь К. І. Астрожскі скончыў свой зямны шлях у 1530 г. і быў пахаваны ў Кіева-Пячэрскім манастыры.

Трэці з выдатных князёў Астрожскі пра якога цяпер належыць сказаць – гэта сын К. І. Астрожскага – Канстанцін (у хрышчэнні Васіль) Кантанцінавіч Астрожскі. Заслугі гэтага чалавека перад Беларуссю і нават перад сусветнай гісторыяй чалавецтва настолькі значныя, што яго імя сапраўды магло б стаць нацыянальным сімвалам Беларусі. Аднак ня гледзячы на ягоныя царкоўныя заслугі ў адрозненне ад свайго прадзеда Феадора ён не кананізаваны царквою. Ён не ўслаўляецца, як ягоны бацька ваеннымі подзвігамі. Але на наш погляд гэтая постаць найбольш выдатная ў гісторыі Беларусі XVI-га стагоддзя.

Нарадзіўся Канстанцін Канстанцінавіч у г. Тураве ў 1526 годзе і правёў там свае дзіцячыя і юнацкія гады, выхоўваўся ў адданасці праваслаўнай веры і атрымаў добрую дамашнюю адукацыю.

У сувязі з асобай гэтага Астрожскага хацелася б адзначыць вельмі важны факт адносна яго светапогляду: Канстанцін Канстанцінавіч быў адным з першых, хто на прамую звязваў веру з нацыянальнымі асаблівасцямі. Пра гэты факт, напрыклад, нам даводзіць А.Яскевіч у кнізе «Падзвіжнікі і іх святыні» , дзе адзначаецца, што князь быў «глыбока перакананым прыхільнікам праваслаўя, які разумеў непарыўную сувязь традыцыйнай хрысціянскай веры з этнічнай самабытнасцю ўсходніх славян». Яго вера была жывая, князь свята прытрымліваўся пастоў, а на Вялікі Пост перад Пасхай адыходзіў у манастыр, дзе праводзіў дні і ночы ў малітвах і богаслужэннях.

Дзейнасць К. Астрожскага на зломе XVI–XVII стагоддзяў была накіраваная на падняцце адукацыйнасці праваслаўнага беларускага народу, на асвету і адраджэнне лепшых традыцый праваслаўнай культуры. Як піша Л. Ляўшун – праваслаўнае адраджэнне, за якое так аддана рупіўся К. Астрожскі павінна было адлюстраваць «Тое нязліўнае адзінства веры і кіруемага ёй розуму, якое было дасягнутая Вялікімі каппадакійцамі»[3]

Захапленне еўрапейскай вучонасцю, што ішла ў часы Рэфармацыі з Захаду не абышло і ВКЛ XVI стагоддзя. Кальвінізм трывала набіраў моц на нашых землях і паступова набываў нацыянальна-арыентаваны характар. Такая фігура як кальвініст Радзівіл Чорны – гэта скарб нацыянальнай беларускай гісторыя. І нездарма сучасны паслядоўнік таго рамантычнага

кальвінізму XVI стагоддзя Лявон Ліпень сцвярджае, што кальвінізм і ёсць нацыянальная вера беларусаў. Такі вывад зроблены не без падстаў. Кальвіністы і трынітарыі неслі асвету ў Беларусь, Сымон Будны выдаў у тыя часы знакаміты «Катэхізіс» на беларускай мове. Нёс сваю асветніцкую ношу Васіль Цяпінскі.

Контррэфармацыя, якую прынеслі каталікі, спахапаўшыся пасля ўнушальных поспехаў пратэстантаў, была салідным ўнёскам у бурны працэс адукацыі, асветы і навуковага прагрэсу ў Беларусі XVI-га стагоддзя. Нездарма гэтае стагоддзе лічыцца Залатым векам беларускай культуры.

На фоне гэтых безумоўных поспехаў каталіцкай і пратэстанцкай місій у Беларусі веры бацькоў – праваслаўю выпала нялёгкая доля. Дзейнасць езуіцкіх школ і актыўны наступ каталіцызму наогул не маглі застацца без увагі К. Астрожскага. Напачатку ідэю сумоўя праваслаўных з католікамі ён актыўна падтрымаў. Яму падабалася тая вучонасць, што неслі калікі, ці як тады казалі – «лацінства», бо занядбаны стан і неадукаванасць простага беларускага селяніна не магла не турбаваць князя. Аднак тое сумоўе , што на самой справе неслі ідэолагі грэка-каталіцызму і якое атрымала потым назву «унія», аказалася механічным спалучэннем, арыфметычным складваннем праваслаўна-грэцкага вучэння з рыма-каталіцкім. І нядоўгае захапленне К. Астрожскага ідэяй уніі змянілася цвёрдым перакананнем яе адмоўнай сутнасці і небяспекі яе смяротнай пагрозы для Святога праваслаўя. Адышоўшы назаўсёды ад канцэпцыі уніі, К.Астрожскі цалкам прысвяціў сябе мэтанакіраванай дзейнасці па адраджэння праваслаўных традыцый візантыйскага накірунку, што яскрава праявіліся ў яго шматграннай дзейнасці. Князь Канстанцін быў не толькі глыбокім вернікам. Будучы па свайму статусу грамадскім і дзяржаўным дзеячом (ужо ў 32 гады ён з'яўляўся ваяводам кіеўскім) ён паводзіў сябе і як прабачлівы палітык. Ён бачыў, якую страшэнную пагрозу незалежнасці Бацькаўшчыны нясе Люблінская унія 1569 года і ўжо на сейме выступаў супраць аб'яднання ВКЛ і Польшчы ў адну дзяржаву. Аднак найбольш непрымірымым і цвёрдым чалавекам паказаў сябе К.К. Астрожскі ў барацьбе паміж праваслаўнай і уніяцкай «партыямі» таго часу.

У 1596 годзе на скліканым мітраполатам Рагозай саборы православных епіскапаў у Брэсце адбылося абвяшчэнне аб'яднання Усходняй і Заходняй Цэркваў ВКЛ. У стварэнні уніі не прыняла ўдзел вялікая колькасць праваслаўнага духавенства сярод якіх найбольш аўтарытэтнымі былі епіскопы Гедэон Балабан – епіскап Львова і Міхаіл Капысценскі – епіскап Пярэмышля. Гэтыя епіскапы разам князем Канстанцінам Астрожскім і іншымі праціўнікамі церкоўнага раскола прыехалі ў Брест і правялі свой праваслаўны, антыуніяцкі Сабор. Духоўным натхніцелем і арганізатарам яго быў Канстанцін (Васіль) Астрожскі. Такім чынам, значная частка праваслаўных (Львоўская, Пярэмышльская епархии і іншыя) засталіся па-за царкоўнай уніі.

На альтэрнатыўным праваслаўным Саборы 1596 года, былі апратэставаны ўсе пастановы уніятаў. І з таго моманту пачаўся працяглы перыяд бескампраміснай барацьбы за чыстату праваслаўнай веры. Грунтоўны аналіз дакументаў і іншай літаратуры прысвечанай гэтаму перыяду зроблены ў кнізе Івана Саверчанкі «Aurea mediocrotas». У сувязі з падзеямі брэсцкага сабору, аўтар прыводзіць вельмі трапныя выніковыя словы-рэзюме кіеўскага архімандрыта Нікіфара Тура: «Не дазволім схіліць нас да новай веры. Не выначамся праваслаўя і набажэнства нашых продкаў. Не адступімся ад правілаў і догматаў святой Усходняй Царквы. Не выйдзем межы, якія вызначылі нашыя бацькі. Не прымем паслушэнства папу рымскаму, застанемся вернымі патрыярху»[4].

Вялікую вядомасць і сусветнае прызнанне атрымаў яшчэ адзін бок дзейнасці К. К. Астрожскага. У 1576 г. у г. Астрог (цяпер Украіна, Ровенская вобласць) князь Канстанцін Канстанцінавіч заснаваў знакамітую славяна-грэка-лацінская Астрожскую Акадэмію. Па традыцыям сярэднявечнай Еўропы там вывучали сем свабодных навук і пяць замежных моў. У Акадэміі дзейнічала мноства адукаваных людзей, сярод якіх рускі першадрукар Іван Фёдараў, выдаўцы Васіль Суражскі і Цімафей Сматрыцкі і іншыя У Астрогу друкавалася навуковая, вучэбная богаслужэбная літаратура.

Сучасная Ўкраіна шануе гісторыю Астрожскай Акадэміі і яе знакамітага заснавальніка. У праекце «Сем цудаў Ўкраіны» Астрог прадстаўляюць адразу два «цуды» Астрожскі замак і Нацыянальная акадэмія Ўкраіны «Астрожская акадэмія». А ў адроджанай Нацыянальнай акадэміі «АА» жывуць традыцыі XV–XVI-х стагоддзяў.

У 2006 годзе адбыўся 425-гадовы юбілей Астрожскай Бібліі. Да гэтага юбілею ўкраінцы зрабілі юбілейнае выданне Астрожскай Бібліі. Украінскае юбілейнае выданне цікавае тым, што гэта не проста перавыданне, а хутчэй навуковая праца грэка-каталіцкага архімандрыта Рафаіла (Рамана Турканяка), якую ён рабіў на працягу 31 года. А.Рафаіл правёў вялікую даследчыцкую працу ў пошуках першакрыніц, на якія абапіраўся князь Канстанцін Астрожскі і ягоныя вучоныя з акадэміі.

Аднак з пункту ж гледжання гістарычнай праўды Астрожскую Біблію трэба безумоўна лічыць спадчынай і беларускай культуры і гісторыі. Па-першае яна была надрукаваная ў 1581 годзе беларусам Іванам Федаровічам (Фёдаравым). Па-другое кіраўніцтва выданнем ажыццяўлялася князем Канстанцінам Астрожскім, які нарадзіўся ў беларускім горадзе Тураве і большая частка яго жыцця прайшла на тэрыторыі Беларусі і галоўнае – ён быў абаронцам праваслаўя на Беларусі, заўсёды змагаўся за нацыянальна-духоўную складаючую культуры і чысціню праваслаўя Вялікага княства Літоўскага.

І па-трэцяе, Астрожская Біблія з'яўляецца тэкстам на царкоўнаславянскай мове ў страбеларуская рэдакцыі. У аснову гэтай Бібліі быў пакладзены грэцкі пераклад LXX, які быў выкананы Супрасльска-Заблудаўскім рэлігійна-асветніцкім гуртком. «Менавіта ў сценах Супрасльскай Лаўры выспявалі ідэі нацыянальнага духоўнага адраджэння, а пазней вынашваліся планы стварэння кананічна вытрыманага і дакладнага пераклада-звода Бібліі» – слушна заўважае А. Яскевіч.

Застаецца толькі сказаць, што застаюцца незразумелымі абыякавыя адносіны нас беларусаў да сваіх вялікіх продкаў Астрожскіх. І не толькі Ўкраіна шануе іх. Як піша часопіс «Пшэглёнд Праваслаўны» («Праваслаўны агляд») (рэдактар Ганна Радзюкевіч) – род Астрожскіх ўшанаваны і на Беласточчыне. Праваслаўнымі вернікамі Польшчы заснаваны Фонд імя князя Канстанціна Астрожскага, які штогод узнагароджвае прэміяй імя Астрожскага найбольш вядомых рупліўцаў на ніве духоўнага адраджэння. Даніна Ўкраіны роду Астрожскіх яшчэ больш значная і памяць аб князях адзначаецца на самым высокім дзяржаўным узроўні. Гэта адлюстравана і ў помніку, які ў 2006 г. быў устаноўлены ў Астрозе. Ён увекавечыў памяць трох Астрожскіх: Фёдара – ў манаскай схіме, Канстанціна Іванавіча – з мячом, Канстанціна Канстанцінавіча – з Бібліяй.

Аднак на самой Беларусі – радзіме роду Астрожскіх яшчэ зроблена мала.

На нашу думку, неабходна найперш звярнуць увагу на наступнае. Па-першае, дзейнасць князеў Астрожскіх – гэта тэорыя і практыка станаўлення беларускай нацыі ў Вялікім княстве Літоўскім. Астрожскія першымі звярнулі ўвагу на неабходнасць усебаковага развіцця чалавека, які спалучае ў сабе рысы дабравернага хрысціяніна і нацыянальна-свядомага чалавека.

Па-другое, князі Астрожскія паказалі непарыўную сувязь патрыятызму, любві да Бацькаўшчыны, Літве-Беларусі з хрысціянствам – за некалькі стагоддзяў да сучасных ўяўленняў аб хрысціянскім вытоках нацыі, што развівалі такія праваслаўныя мысліцелі як М. Бярдзяеў, У. Салаўёў, І. Ільн і інш.

Зразумела, што настаў час па-сапраўднаму ацаніць творчасць і практычны ўнёсак Астрожскіх у беларускую нацыянальную культуру, у развіццё і распаўсюджанне праваслаўя на нашых землях як аснову менталітэту беларускай нацыі.

Неабходна шырока вывучаць гэты амаль невядомы нашаму сучасніку скарб духоўнасці ад сярэдняй школы да праграм вышэйшых навучальных устаноў. Наспела неабходнасць стварэння беларускіх перакладаў Астрожскай Бібліі накшталт згаданага украінскага, а улічваючы выдатныя выдавецкія традыцыі беларусаў – і лепшага выдання. Настала таксама неабходнасць ліквідацыі белых плямаў нашай гісторыі ў перыяд ВКЛ і Рэчы Паспалітай. Праваслаўны фак-

тар у гісторыі тых часоў не павінен быць зацемнены каталіцкай ці уніяцкай экспансіяй з Захаду. І гераічнае жыццё князёў Астрожскіх – таму неабвярджальны доказ.

[1] Яськевіч А. Падзвіжнікі і іх святыні. – Мн., 2002. – 365 с.

[2] Костомаров Н. И. Русская история в жизнеописаниях ее главнейших деятелей. – Гл. 22. – М., 1993. – 608 с.

[3] Левшун Л. Благоверный князь Констанцин-Василий Острожский как «зеркало» религиозных поисков литвинов // Вестник белорусского экзархата. Благоверный князь Острожский. Альманах. Том 1. Мн., 1996. – С. 29–35.

[4] Саверчанка І. Aurea mediocritas. Кніжна- пісьмовая культура Беларусі: адраджэнне і ранняе барока. – Мн., 1998. – 319 с.

*Три фигуры, три князья Острожские: Федор, Константин Иванович и Константин (Василий) Константинович – это наша славная история, наша национальная гордость, это прочный фундамент белорусской национальной идеи. Деятельность князей Острожских – это теория и практика становления белорусской нации в Великом княжестве Литовском. Князья Острожские первыми обратили внимание на необходимость всестороннего развития человека, сочетающего в себе черты благоверного христианина и национально-сознательного человека, показали неразрывную связь патриотизма, любви к Отечеству с христианством – за несколько веков до современных представлений о христианских истоках нации.*

*Ключевые слова: Князья Острожские, Великое княжество Литовское, белорусская национальная идея, патриотизм, христианство.*

*Three figures, three princes of Ostrog: Fedor and Konstantin Konstantin (Basil) K. – this is our glorious history, our national pride, it is a solid foundation of Belarusian national idea. Activities of the princes of Ostrog is a theory and practice of formation of the Belarusian nation in the Grand Duchy of Lithuania. Ostroh princes first drew attention to the need for full human development, combining the features of the faithful Christian and national-conscious man, showed the inseparable bond of patriotism, love for the Fatherland and Christianity – for centuries before modern ideas about the origins of the Christian nation.*

*Keywords: Princes of Ostrog, Grand Duchy of Lithuania, the Belarusian national idea, patriotism, Christianity.*